# СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 24 (39), 12–18.10. 2006 г.


# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

## ГАЛАДОЎКА І СТРАЙК СТАНОВЯЦЦА Ў БЕЛАРУСІ ЗВЫКЛЫМІ З’ЯВАМІ

*Больш за сто трыццаць чалавек падтрымалі пост-галадоўку пратэстанцкіх вернікаў у Мінску. Сябры мінскай абшчыны пратэстанцкай царквы “Новае жыццё” такім чынам вырашылі абараніць свой малітоўны дом і свае правы.*

Некалькі гадоў таму абшчына пратэстанцкай царквы “Новае жыццё” набыла на ўскраіне Мінска кароўнік, які належаў калгасу імя Міхаіла Калініна. Знайсці іншы будынак у сталіцы вернікам не ўдалося – гарадскія ўлады адмаўлялі ім у памяшканні. За кароткі час была праведзеная рэканструкцыя, у выніку чаго кароўнік ператварыўся у малітоўны дом з сучасным інтэр’ерам. У нядаўняй савецкай гісторыі ёсць шмат прыкладаў, калі храмы ператвараліся ў кароўнікі ці свінарнікі, альбо руйнаваліся дашчэнту. Адваротных прыкладаў значна меней…



**Вернікі абшчыны** *поўнаевангельскай хрысціянскай царквы «Новае Жыццё» трымаюць галадоўку-пост на знак пратэсту супраць намеру ўладаў забраць у іх дом малітваў. Мінск, 4 кастрычніка 2006 году.*

Мінскі гарвыканкам настойвае на тым, што малітоўны дом створаны незаконна. У 2005 годзе ў “Навага жыцця” быў канфіскаваны зямельны ўчастак, дзе стаіць храм. А ў ліпені 2006-га гаспадарчы суд Мінска абавязаў царкву прадаць дом за 17 тысяч даляраў і вызваліць памяшканне на вуліцы Кавалёва, 72 (каля мікрараёна “Сухарава”) да 8-га кастрычніка. Мінгарвыканкам пералёў грошы (каля 35 мільёнаў рублёў) на рахунак царквы. Але вернікі адмовіліся пакідаць свой храм і 6-га кастрычніка вырашылі распачаць пост-галадоўку. Галадаванне можа прычыніць шкоду здароўю і нават стаць прычынаю смерці чалавека, таму любая царква асуджае такі ўчынак, як і самагубства. Але ніхто не можа забараніць вернікам трымаць пост.

У самой царкве галадуюць, застаючыся там нават уначы, каля трыццаці чалавек. Яшчэ звыш ста чалавек – вернікаў розных пратэс-

**Працяг на стар. 3**

## ШТО БУДЗЕ , КАЛІ НЕ СТАНЕ ЛУКАШЭНКІ?

### ПРАЦЯГ ТЭМЫ

► СТАР.2, 4

## СКАЧКІ БЕЗ ВЕРШНІКАЎ АБО САПРАЎДНАЕ СВІНСТВА

### АГЛЯД РАДЫЁ

► СТАР.6

# ШТО БУДЗЕ Ў БЕЛАРУСІ, КАЛІ ЗАЎТРА НЕ СТАНЕ ЛУКАШЭНКІ?

**Заканчэнне. Пачатак – у мінулым нумары.**

**АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ, ЛІДЭР АБ'ЯДНАНАЙ АПАЗІЦЫІ:**

## "БУДЗЕ ГЛЫТОК СВЕЖАГА ПАВЕТРА"

Ніякага хаосу не будзе. Калі Сталін яшчэ жыў, усе думалі – не будзе яго, пачнецца канец света. Нічога не здарылася. Хоць сістэма была абсалютна жорсткая, пірамідальная. Тое самае будзе і ў нас. Ніхто ж не будзе браць сякеру і ламаць, біць. Усё будзе, як раней. Проста людзі ўздыхнуць з палёгкай, адчуюць рэальную свабоду. Калі была прэзідэнцкая выбарчая кампанія, і людзі мне падобныя пытанні таксама задавалі, я адказваў, што мы не збіраемся ламаць тое, што дзейнічае. Нават калі яно нам не падабаецца. Калі калгас вытрымае, хай сабе жыве. Новае будзем будаваць, не ламаючы старога. Так што ніякага абвалу не адбудзецца. Будзе глыток свежага паветра. Чыноўнікі вертыкалі першыя скажуць нам "дзякуй". Бо ў нас нагнятаецца вялікі страх, а ніхто ў нашым грамадстве не мае столькі страху, колькі чыноўнікі.

**ІНКОГНІТА, ЧЫНОЎНІК ДЗЯРЖАПАРАТА:**

## "ПАЧНЕЦЦА ВЯЛІКАЕ БЯЗЛАДДЗЕ"

Вялікая верагоднасць таго, што пачнецца вялікае бязладдзе. Хутчэй гэта будзе, чым тое, што нехта тут здолее ўзяць уладу, усё структураваць і ўлагодзіць. Таму што няма ні партыяў, ні асобаў, якія здольныя на гэта.

**ВІНЦУК ВЯЧОРКА, ЛІДЭР БНФ:**

## "БОЛЬШАСЦЬ АДКАЗНЫХ ЛЮДЗЕЙ ЧАКАЮЦЬ ТАКОЙ ЗМЕНЫ"

Пытанне абсалютна шматварыянтнае. Калі б гэта адбылося пасля таго, як Масква адшукала яму наступніка і здолела б, інтэграваўшы яго ў беларускае палітычнае поле, прывесці да ўлады, будзе адзін вынік. Ён нічога добрага не прадвяшчае. Калі гэта будзе вынік сістэмнай працы дэмакратычных сілаў, то ніякага хаосу не будзе. Большасць адказных людзей у нашай краіне чакаюць такой змены і гатовыя ўзяць на сябе сваю долю адказнасці за пераход ад дыктатуры да дэмакратыі. Калі гэта будзе палацавы пераварот, таксама не будзе нічога добрага. Бо такі пераварот можа пасеяць непатрэбныя ілюзіі. Возьмем за прыклад Азербайджан. Там удала дамовіліся паміж сабой стары і малады Аліевы. Што, бясспрэчна, пасеяла дэзарыентацыю ў лагеры дэмакратычных сілаў і ў свеце. Палацавы пераварот дэстабілізаваў бы сітуацыю ў нашай краіне. Але не факт, што ён прывёў бы да перамогі незалежніцкіх, дэмакратычных сілаў. Яшчэ горш, калі б яго арганізавала Масква.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "АПАЗІЦЫЙНЫЯ ПАЛІТЫКІ НЕ ЗДОЛЬНЫЯ ПЕРАХАПІЦЬ УЛАДУ»

У нас, дзякуй Богу, дыктатура трымаецца ўсяго толькі 12 гадоў. Хоць за гэты час шмат чаго разбурана. 12 гадоў – гэта столькі ж, колькі трымалася фашысцкая дыктатура ў Германіі. Разбурэнне асобы пры Гітлеры было вельмі значнае. Калі вайна скончылася і Германія была акупаваная саюзніцкімі войскамі, то яна, як дзяржава, не была гатовая да самакіравання. Спатрэбілася некалькі гадоў акупацыі перад тым, як яна пачала адбудоўвацца наноў. Зноў жа, дзякуй Богу, глыбіня разбурэння асобы, якая сёння ёсць у Беларусі, не такая, як было ў нацысцкай Германіі. Таму мы пройдзем гэты перыяд значна лягчэй. Але, на жаль, апазіцыйныя палітыкі менш за ўсё здольныя сёння перахапіць уладу. Калі дзяржаўныя дзеячы будуць здольныя трымаць гаспадарку, галіны адукацыі, ахову здароўя… Такія людзі яшчэ ёсць у чыноўніцкім апараце, і па-за апаратам ёсць, але не ў палітычных апазіцыйных партыях.

**АЛЯКСАНДР ДАБРАВОЛЬСКІ, АБ'ЯДНАНАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ ПАРТЫЯ:**

## "ЛЮДЗІ АДЧУЮЦЬ ПАЛЁГКУ"

Па-першае, пачнецца цікавае жыццё. Па-другое, будзе такая сітуацыя, калі людзі адчуюць уласную годнасць. Яны адчуюць палёгку, таму што да іх так ці інакш пачнуць прыслухоўвацца. А наконт таго, як будуць развівацца падзеі… Калі змены адбудуцца ў выніку палацавага перавароту, то тады пачнецца бойка паміж тымі, хто бліжэй да ўлады. Тым не менш, лепш такая нестабільнасць, чым сённяшняя стабільнасць. У Беларусі няма падставаў для таго, каб тут штосьці вельмі кепскае адбылося. Вельмі добрыя шанцы дасць супрацоўніцтва з краінамі Еўропы, з Амерыкай. І я думаю, што захаваюцца добрыя адносіны з Расіяй. Хаця, гэта будзе залежыць, хутчэй, не ад нас, а ад Расіі.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "БУДЗЕ ЖЫЦЬ БЕЗ ЯГО БЕЛАРУСЬ"

Усе дэмакратыі падобныя больш-менш адна да адной. Але няма двух падобных дыктатараў. Кожны з іх фармуе свае прынцыпы ўлады, прынцыпы існавання ўсяго соцыюма пад сябе. Персанальны стыль. Паколькі другога Лукашэнкі ў прыродзе быць не можа, то якія б палітычныя сілы ні прыйшлі на яго замену, давядзецца перафарматоўваць усё тое, што ён зрабіў. Так, як сёння, можа быць толькі пакуль ёсць Лукашэнка. І чым даўжэй цягнецца дыктатура, тым даўжэй давядзецца пераадольваць яе наступствы. Разам з тым, я б не перабольшваў тыя катастрофы, якія могуць нас чакаць. Калі мы паглядзім на навейшую гісторыю, як сыходзілі дыктатары – Франка, Пiначэт, альбо аўтарытарны рэжым Мечыяра ў Славакіі, то ніякага там гіперкрызісу, землятрусу не адбывалася. Нават у Югаславіі, дзе амерыканцы змусілі бомбамі сысці дыктатара, нічога страшнага не здарылася. Гэта я да таго, што не трэба сябе лішні раз палохаць. Канечне, кожны раз прывыканне, асабліва, калі дыктатура цягнецца доўга, бывае настолькі моцным, што нешта іншае здаецца ўжо немагчымым. Мільёны плакалі, калі Сталін сыйшоў, але не таму, што ім Сталіна было шкада. Страх быў ад таго, што "а як інакш?" Але ўсё будзе добра. Будзе жыць без яго Беларусь. Гэта не значыць, што пасля яго адразу цуд нейкі здарыцца, заквітнеюць раптам беларушчына і дэмакратыя. Гэта зусім не так. Трэба будзе паступова пачынаць жыць так, як жывуць усе еўрапейскія дзяржавы.

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

## ГАЛАДОЎКА І СТРАЙК СТАНОВЯЦЦА Ў БЕЛАРУСІ ЗВЫКЛЫМІ З'ЯВАМІ

**Працяг са стар. 1**

танцкіх цэркваў, а таксама іншых хрысціянскіх канфесій трымаюць галадоўку па-за межамі малітоўнага дому. Уначы большасць з іх збіраюцца ў храме, каб бараніць яго ад захопу.

Сярод вернікаў ёсць каля дзясятка пастараў з Барысава, Брэста, Гомеля, Гродна, Мазыра, Талачына ды іншых беларускіх гарадоў. Падтрымку выказваюць шматлікія пратэстанцкія абшчыны ў замежжы.

Колішні намеснік кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі, былы дэпутат Іван Пашкевіч, які цяпер з'яўляецца дарадцам старшыні Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў, выказаў перасцярогу. У сваім публічным лісце ён папярэдзіў:

*"Вельмі добра ведаючы характар Лукашэнкі, след чакаць арыштаў галадоўнікаў, прымянення сіл АМОНа супраць іх, збіцця, не здзіўлюся, калі спецтэхніка зруйнуе будынак малітоўнага дому, як гэта надоечы зрабілі ў дачыненні да аўтакефальнае праваслаўнае царквы.*

*Біблія вучыць, што хрысціян часам адусюль гнятуць, але яны не прыгнечаныя; бываюць у роспачным стане, але не ўпадаюць у роспач; іх гоняць, але яны не пакінутыя; іх валяць, але яны не гінуць (**2 Карынф. 4:8–9**). Мы ведаем, што напярэдзе ў Лукашэнкі і такіх, як ён сам, суд чалавечы і суд Божы. Але мы як сапраўдныя хрысціяне не прагнем крыві, але молімся за яго і такіх, як ён, і просім: «Даруй ім, Божа, бо не ведаюць, што чыняць».*

Выхаванец дзіцячага дому Іван Пашкевіч, які дасягнуў немалой улады, пасля сыходу з дзяржаўных пасадаў не перайшоў у апазіцыю, падобна іншым былым чыноўнікам. Досыць доўгі час ён маўчаў. Але ж не вытрымаў, узняў свой голас у абарону тых, каго "адусюль гнятуць".

У многіх з нас, выхаваных на савецкіх кінафільмах "пра сектантаў" і "навуковым атэізме", могуць не выклікаць асаблівых сімпатыяў пратэстанты. Праваслаўная царква, асабліва праваслаўныя рэлігійныя святы за апошнія гады зрабілася ўжо як бы звыклай часткай паўсядзённага жыцця – нават кіраўнік дзяржавы ходзіць у царкву і хрыстосуецца на Вялікдзень. З ксяндзамі ён таксама падтрымлівае адносіны, Папу Рымскага запрашаў наведаць Беларусь з візітам.

А вось пратэстантаў дзяржава чамусьці не любіць. Іх малітоўныя дамы ўлады зачыняюць ужо не першы раз. Можа, камусьці не падабаюцца іх малітвы, іх стыль паводзін, манера гаварыць? Але якое гэта можа мець значэнне, калі перад законам павінны быць роўныя ўсе грамадзяне, незалежна ад веравызнання? Магчыма, абшчына "Новага жыцця" парушыла нейкія законы ці інструкцыі? Дык чаму тады ўладам не патлумачыць гэта проста і адкрыта – і не толькі самім вернікам, а ўсім грамадзянам?

Але чамусьці верыцца, што ўлада можа пайсці на ўсё – нават зруйнаваць храм, а вернікаў арыштаваць. Відаць, таму, што вернікаўпратэстантаў арыштоўвалі ўжо на нашых вачах на Плошчы – разам з іншымі ўдзельнікамі намётавага гарадка падчас сакавіцкіх падзеяў у Мінску. І амонаўцаў не спынілі малітвы…

Неяк так супала, што на наступны дзень пасля таго, як вернікі "Новага жыцця" распачалі свой пост-галадоўку, у Мінску здарылася яшчэ адна надзвычайная падзея. У ранішнім эфіры "Новага радыё", заснавальнікам якога выступае праўрадавая Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, прагучала абвестка: мы пачынаем страйк на рабочых месцах. Пратэст атрымаўся вельмі нерашучы. Журналісты ўсяго толькі звярнуліся з просьбай да Лукашэнкі разабрацца ў праблемах радыёстанцыі і абараніць яе ад свавольства чыноўнікаў. Але ж рэакцыя ўладаў была апаратыўнай, бязлітаснай і жорсткай. Большасць супрацоўнікаў, услед за галоўным рэдактарам радыё, за якога яны заступіліся, звольненыя. Радыё замоўкла – прынамсі, на месяц. І гэта дзеянні прафсаюза, які паводле вызначэння абавязаны бараніць правы наёмных работнікаў!

Пасля Рада бяспекі Беларусі стварае камісію, прадстаўнікі якой ходзяць па рэдакцыях і вывучаюць настрой у калектывах іншых ФМ-радыёстанцыяў Мінска, каб, крый Божа, хто-небудзь не насмеліўся пайсці за прыкладам "бунтаўнікоў".

Калегі з дзяржаўных СМІ прамаўчалі. Тут няма чаго здзіўляцца.

Дзіўнае і вартае захаплення іншае. Тое, што ва ўмовах праверак, запалохвання і прамывання мазгоў усё яшчэ знаходзяцца людзі, здольныя рабіць учынкі. Нават на дзяржаўным радыё.

Горад зрабіў выгляд, што гэтага ўчынку не заўважыў. Гэтаксама намагаюцца грамадзяне не заўважаць і таго, што адбываецца вакол царквы "Новае жыццё".

Можна доўга і ўпарта не заўважаць свавольства ўлады і пераконваць сябе, што нас гэта не тычыцца. Але не заўважаць маральных учынкаў суайчыннікаў немагчыма. Некалі ж сапраўды давядзецца пачынаць новае жыццё.

**А.Уласаў**

# УЛАДА ЗНАЙШЛА АДКАЗНАГА ЗА ЎСЕ ЗЛАЧЫНСТВЫ

Паводле падазрэння ў "тэракце" арыштаваны моладзевы актывіст з Жодзіна Павел Красоўскі. Летась у верасні ў Віцебску ў выніку серыі выбухаў былі паранены людзі. Але КГБ тады запэўніваў, што выбухі не мелі ніякага дачынення да тэрарызму.

Павел Красоўскі быў дастаўлены ў следчы ізалятар у Віцебску – да "месца злачынства". Старшы следчы па асоба важных справах пракуратуры РБ Аляксандр Расолька, які вядзе справу Красоўскага, вылучыў супраць яго таксама абвінавачанні ў згвалтаванні і забойстве. Яму можа пагражаць смяротнае пакаранне.



**Павел Красоўскі.**

Адвакаты і праваабаронцы лічаць справу Красоўскага палітычна матываванай. У яго абарону выступілі сябры незарэгістраванай арганізацыі Малады Фронт. Яе лідэр Зміцер Дашкевіч знаходзіцца ў мінскай турме на Валадарцы. Яго чакае суд – у тым ліку, таксама па абвінавачанні ў тэрарыстычнай дзейнасці. У падтрымку Дашкевіча і Красоўскага ў розных гарадах Беларусі прайшлі пікеты салідарнасці.

**Паводле СМІ**

СВАБОДА

# КАЛІ ЗАГАСАЕ СОНЦА

## КУЛЬТУРА — АДЗІНЫ РЭАЛЬНЫ ЧЫННІК, ЯКІ МОЖА ПРЫМУСІЦЬ ЧАЛАВЕКА АДМОВІЦЦА АД ШТОДЗЁННАЙ ЛУКАШЭНКАВАЙ ТАБЛЕТКІ

Пытанне "Што будзе, калі заўтра не стане Лукашэнкі?" аказалася для большасці нашых рэспандэнтаў сапраўднай нечаканасцю. Нібы мы пыталіся: "Што будзе, калі згасне сонца?" І адказы атрымаліся зусім няясныя і ўразнабой, нібы гаворка ідзе не пра звычайнага смяротнага чалавека-чыноўніка, а пра нябеснае цела. Стала нават неяк страшнавата ад таго, што мы ўсе настолькі бездапаможныя і не здольныя ўявіць сабе таго, што з абсалютнай верагоднасцю можа адбыцца ўжо сёння ўначы.

Прычына гэтай бездапаможнасці зразумелая. Калі дзяржаўная прапаганда з дня ў дзень і з году ў год выстаўляе асобу прэзідэнта мярылам усяго і ўся ў краіне, тады адбываецца падмена панятказ. Замест вечных катэгорыяў свабоды, закону, радзімы, веры і вернасці, а ўрэшце – жыцця, мы маем вечную катэгорыю прэзідэнта, пры гэтым свабода ці радзіма ператвараюцца ў катэгорыі адносныя, часовыя і залежныя. Вось чаму пытанне "што будзе, калі не стане закона?" або "што будзе, калі не будзе свабоды?" было б для нашых рэспандэнтаў больш прадказальным і зразумелым.

**Калі сёння Лукашэнка – гэта абавязковая для кожнага штодзённая таблетка ад дэструкцыі і нестабільнасці, дык заўтра гэта ўжо будзе кропельніца, а злёгку прычмурэлы за гэтыя 12 гадоў народ ляжа на дол каматозным целам, не здольным паварушыць рукой, не тое што думаць – а што будзе заўтра?**

За 12 гадоў кіравання Лукашэнкі беларускі народ у сваёй здольнасці да самастойнага жыцця, самаарганізацыі і выжывання быў адкінуты на цэлую эпоху назад. Нядаўняя гісторыя Вікі Мароз стала метафарай таго, што здарылася з усёй нацыяй. Атрымаўшы ад літасцівага Бога шанец на шчаслівае жыццё ў вольным свеце, яна была вернутая бязлітасным чыноўнікам у дзяржаўны прытулак і пазбаўленая найменшай магчымасці ўплываць на свой уласны лёс. Сапраўды, перамагла праўда – чыноўніка, дзяржавы, сусветнай бюракратыі. Але праўда Вікі сталася пераможанай.

У такім самым стане апынуўся і ўвесь народ. Яго свабода памяняная на гарантаваную "міску поліўкі" – казённую міску з казённым надпісам "стабільнасць". А ягонае заўтра гарантаванае словам "бацька". Па сутнасці "бацька" – гэта і ёсць заўтра, за якое галасуюць беларусы і за якое беларускі часцяком ставяць у цэрквах свечкі.

У нас насамрэч не будзе хаосу, калі гэтага бацькі не стане. Але не дзякуючы здольнасці да самаарганізацыі, а дзякуючы выключна нашай ментальнай звычцы не высоўвацца. Калі не стане Лукашэнкі, беларускі народ западзе ў глыбокую дэпрэсію, а што з ім будзе далей – вырашаць будзе хто заўгодна, толькі не ён сам. Пры гэтым чым далей цягнецца гэты эпізод нашай гісторыі, пазначаны імем першага прэзідэнта, тым болей у народзе страчваецца гэтая здольнасць да самаарганізацыі і выжывання. Калі сёння Лукашэнка – гэта абавязковая для кожнага штодзённая таблетка ад дэструкцыі і нестабільнасці, дык заўтра гэта ўжо будзе кропельніца, а злёгку прычмурэлы за гэтыя 12 гадоў народ ляжа на дол каматозным целам, не здольным паварушыць рукой, не тое што думаць – а што будзе заўтра?



belzhaba.org

Апытанне лішні раз засведчыла, што працэс разурэння асобы, пра які кажа Ул.Мацкевіч, за гэтыя 12 гадоў стаў стабільным і працягваецца. Ніхто з рэспандэнтаў не абнадзеіў нас сваім уласным прыкладам, ніхто не сказаў, што мае ясны план дзеянняў на выпадак раптоўнага сыходу ППРБ. Маўляў, не хвалюйцеся, усё пад кантролем і кожная няштатная сітуацыя прадугледжваецца. Ніхто, апроч Ірыны Пісьменнай, якая заўтра, калі не стане Лукашэнкі, будзе пісаць вершы і здымаць фільмы. Гэта значыць, што дакладны адказ на наша пытанне ведае Культура. Паніжаная сёння на ўсіх узроўнях, недаацэненая і загнаная ў падполле, падмененая муляжамі і фанаграмамі, жывая беларуская Культура ёсць адзіным рэальным чыннікам, які можа прымусіць чалавека адмовіцца ад штодзённай Лукашэнкавай таблеткі і не дайсці да Лукашэнкавай кропельніцы.

Яна, нібы трава праз асфальт, праб'ецца ў кожнай сітуацыі, бо, у адрозненне ад палітыкі ці эканомікі, не залежыць ад кан'юнктуры. Яна можа аб'яднаць прыхільніка ППРБ з яго праціўнікам. Яна ператварае натоўп у народ. Урэшце, гэта яна – сапраўдная беларуская культура – наш бацька і наша сонца. Рана ці позна прыйдзе той дзень, калі Лукашэнкі не стане, і людзі азірнуцца на саміх сябе і засаромеюцца свайго ўчорашняга самападману, калі верылі ў іншага "бацьку" і грэліся іншым "сонцам".

**Алесь Кебік**

# БУДАЎНІКАМ СКАЗАЛІ ДЗЯЛІЦЦА

## ПРАМЫСЛОВАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў БЕЛАРУСІ МОЖА ЎЗДАРАЖЭЦЬ НА ЧВЭРЦЬ

Указ № 499 «Аб некаторых мерах па абнаўленні асноўных сродкаў у будаўнічай галіне” быў падпісаны Аляксандрам Лукашэнкам сёлета 4 жніўня. Але расплочвацца за яго беларускім будаўнікам давялося задняй датай – ажно з ліпеня. І гэта толькі пачатак.

На першы погляд, дакумент скіраваны на добрыя мэты – абнаўленне асноўных фондаў прадпрыемстваў. Ён прадугледжвае стварэнне пры Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва фонду, куды ўсе прадпрыемствы галіны павінны будуць адлічваць сродкі – “у памеры не больш за 13,5 % сабекошту прадукцыі, тавараў і паслуг, атрыманых (выкананых) пры ажыццяўленні дзейнасці ў галіне будаўніцтва, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў”. За кошт гэтага фонду, паводле задумы распрацоўнікаў дакумента, будаўнікі змогуць набываць новыя будаўнічыя машыны, транспарт, тэхналагічнае абсталяванне.

Аднак, на думку спецыялістаў, указ прывядзе толькі да… росту цэнаў на будаўніцтва. Ясна, што працэнты, якія будуць адлічвацца ў фонд, не бяруцца з паветра. Кошт праектнай дакументацыі павялічваецца на 4,5%, будаўнічых работ – на 13,5%. Складзем гэтыя лічбы і атрымаем у выніку ўздаражэнне будаўніцтва на 22,5%! Пытанне: ці шмат у Беларусі заказчыкаў, якія змогуць без праблем заплаціць за будаўніцтва амаль на чвэрць больш, як дагэтуль?

Праўда, рост цэнаў адбудзецца не адразу. Бо ў нашай дзяржаве існуюць іншыя ўказы і пастановы. Паводле іх максімальны рост індэкса цэнаў і тарыфаў на работы і паслугі на тэрыторыі Беларусі можа складаць не больш як 0,6 % у месяц. Але ж страты будаўнічых прадпрыемстваў дасягнуць у бліжэйшы час ад 7,5 да 11,5%, што можа паставіць многія з іх на мяжу банкруцтва.



**Будаўніцтва шматпавярховага** *дому. Мінск, кастрычнік 2006 году.*

Распрацоўнікі дакумента асоба адзначылі, што яго дзеянне не тычыцца жыллёвага будаўніцтва. Цэны на квадратны метр жылля ў Мінску ўжо дасягнулі сярэдніх цэнаў на квадратны метр жылля ў ЗША. Куды ўжо вышэй? Тым больш, што паводле ўзроўню даходаў Беларусі да Амерыкі яшчэ расці і расці.

Тым не менш, будаўніцтва было ў Беларусі той галіной, якая развівалася да апошняга часу найбольш дынамічна. Цяпер жа, на думку спецыялістаў, на ёй можна ставіць крыж. Дапамога з узгаданага вышэй фонду будзе, паводле старой традыцыі, вылучацца тым, хто найбольш адстае – г.зн., найбольш марудлівым і няўмелым.

Цікава, што падпісаны ў жніўні прэзідэнцкі ўказ уступіў у сілу з… ліпеня. Так што ўжо тры месяцы прадпрыемствы галіны вымушаныя адлічваць мільёны рублёў у новаствораны фонд.

Многія эканамісты лічаць, што прычынай стварэння такога фонду стала зусім не жаданне абнавіць тэхніку ў будаўнічых арганізацыях, бо рабіць гэта падобным чынам проста недарэчна. Хутчэй за ўсё, беларуская эканоміка не вытрымлівае нечуваных тэмпаў росту. У сувязі з гэтым у дзяржавы перыядычна сканчаюцца грошы, а іх трэба аднекуль браць. З «Беларуськалія» узяць нешта ўжо цяжка – ў яго без таго праблем хапае — са збытам прадукцыі. Цэны на нафту таксама пачынаюць пацiху падаць. Што ў нас пакуль яшчэ дыхае? А, будаўніцтва! Дык хай будаўнікі і падзеляцца.

Вось такая логіка. А можа, сапраўды распрацоўнікі ўказа не знаёмыя з рынкавымі метадамі, якімі можна дапамагчы прадпрыемствам абнавіць парк тэхнікі – напрыклад, вызваліўшы іх ад часткі падаткаў? Ва ўлады паранейшаму, здаецца, ёсць адна толькі ідэя на ўсе выпадкі жыцця, узятая са старога арсеналу – каса ўзаемнай дапамогі. Інакш кажучы, адняць усё ды падзяліць…

**Сяргей Паляжаеў**

“Саюздрук”

# ШЧАСЛІВАЯ МАЦІ СА СТА ТЫСЯЧАМІ

## АЛЬБО МАКДОНАЛЬДС І ДОХЛЫЯ ПАЦУКІ

“Звязда” не стамляецца прапагандаваць дасягненні дзяржавы ў сацыяльнай сферы.

*“Сёння кожная жанчына пры нараджэнні дзіцяці атрымлівае аднаразовую, на дзіця да трох гадоў — штомесячную (сёння 102,7 тысячы беларускіх рублёў) дапамогу, а таксама, калі даход недастатковы, штомесячную дапамогу на дзіця пасля трох гадоў. Пры нараджэнні трэцяга і наступных дзяцей аднаразовая дапамога выплачваецца ў памеры трохразовага пражытачнага мінімуму. Маці, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей да 16 гадоў, прадастаўляецца адзін свабодны дзень у тыдзень з аплатай у памеры сярэдняга дзённага заробку.”.*

Пагадзіцеся, такі клопат уражвае. Але чамусьці ў Беларусі сем’яў, дзе трое і болей дзяцей, толькі 6 працэнтаў. Штосьці не спяшаюцца беларусы скарыстацца з таго дзяржаўнага клопату. Вось бы адразу нараджаліся тройні, як было б добра! Але па нараджэнні другога дзіцяці ў маладой маці забяруць тую мізэрную дапамогу на першае дзіця, калі тое дасягне трох гадоў. І застанецца шчаслівая маці са ста тысячамі на двух дзяцей і новымі выдаткамі на садок. Тут ужо не да трэцяга. Добра, калі бацька атрымлівае сярэднюю зарплату ў 600000. Але, падазраю, што такіх таксама няшмат.

У газеце “Рэспубліка” з’явіўся артыкул, прасякнуты духам канца 40-х гадоў, калі ўсе савецкія людзі змагаліся з “нізкапаклонствам перад Захадам”. Чытаць такое сёння – задавальненне не меншае, чым слуханне старых грамафонных кружэлак.

*“О системе быстрого питания корпорации «Макдональдс» сказано уже много «теплых» слов, особенно в европейской прессе. Мало того, что гамбургер — представитель отнюдь не диетического питания (даже по сочетанию продуктов), так, по утверждению немецких ученых, блюда из Макдональдса крайне вредны для здоровья. К такому выводу пришли немецкие ученые, два года кормившие ими подопытных крыс. Проводя наблюдения над животными, ученые обнаружили, что уже к девятому месяцу эксперимента их подопечные полностью потеряли способность размножаться, а к шестнадцатому — стали страдать сердечной недостаточностью.”.*

*Дык вось чаму ў нас такая кепская дэмаграфія. Тыя беларусы, што ўпершыню пакаштавалі біг-мак, не могуць, а тыя, хто грунтоўна падсеў на гамбургеры, ўжо не хочуць.*

Газета “Советская Белоруссия» пацешыла чытачоў інтэрвію з вядомым расійскім комікам Іллёй Алейнікавым. Артыст пажартаваў наступным чынам:

*“Я не хочу быть главой государства ничьей страны, потому что совершенно не умею руководить. А таких руководителей, как, например, ваш Президент, и вовсе больше нет. Он делает то, чего не делает никто! Я помню Беларусь 1992 — 1993 годов: «зайчики», хмурые люди, не знающие, как будут жить завтра, хаос. Сейчас я приезжаю в абсолютно упорядоченную европейскую страну, ухоженный, чистый город и вижу совершенно другие лица. У вас нет омерзительной разницы между богатыми и нищими, у вас есть условия для развития так называемого среднего класса. А однажды после съемок мне пришлось пройтись по ночному Минску пешком, причем совсем не центральными улицами. В Ленинграде во время подобной прогулки можно совершенно спокойно получить по голове, а здесь можно просто наслаждаться спокойствием”.*

Штосьці я не ацаніў тонкасці жарта. Бо “зайчыкі” пакуль нікуды не зніклі. На тварах мінакоў па-ранейшаму пануе сум. Розніца паміж багатымі і жабракамі, вядома, мае не расійскі маштаб, але гэта не робіць яе менш адчувальнай. А наконт асалоды ад начнога шпацыру спадару Алейнікаву трэба пагутарыць з гісторыкам культуры Адамам Мальдзісам, журналістам Паўлюком Канавальчыкам, тэатральным рэжысёрам Валерыем Мазынскім і шмат яшчэ якімі дзеячамі культуры й навукі, а таксама палітыкамі, якія “спакойна атрымлівалі па галаве” каля ўласнага дома ці дзе-небудзь у цэнтры сталіцы.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# СКАЧКІ БЕЗ ВЕРШНІКАЎ

## АБО САПРАЎДНАЕ СВІНСТВА

На мінулым тыдні замежныя радыёстанцыі паведамілі пра чарговае судзілішча над дзеячом Саюзу палякаў Мечыславам Яскевічам. Нібыта ён перашкодзіў рабоце здымачнай групы БТ. Найбольш падрабязна распавядала пра ўсё Радыё Палонія. І гэта добра – каб чалавек мог сам разабрацца, хто вінаваты. Я, напрыклад, калі б быў прысяжным засядацелем, вынес бы вердыкт: чалавек невінаваты. Але яго засудзілі на чацвёра сутак арышту. І трэба было б у гэтых рэпартажах назваць і “антыгерояў” – суддзяў, следчых, сведкаў. Хай ім стане сорамна, хай іхнім бацькам, дзецям, сябрам стане сорамна. Пакуль нам усім не стане сорамна за тое, што адбываецца ў краіне, нічога не зменіцца.

Далей пра “Нашу Ніву”. У Мінску адбылася юбілейная вечарына – прэзентацыя кнігі пра беларускую паэзію. На Радыё Рацыя карэспандэнт Мінчонак робіць рэпартаж і бярэ інтэрв’ю. У каго б вы думалі? У паэтаў Скоблы і Арлова. Харошыя хлопцы, але ж іхнія галасы мы кожны дзень чуем у Радыё Свабода. Няўжо ж няма іншых паэтаў? І яшчэ: на Радыё Свабода пачалася новая перадача – чытаюць старую паважаную газету. Але анонс кожны раз гучыць з памылкай: “100 гадоў “Нашай Нівы”. Але ж правільна будзе: “100 гадоў “Нашай Ніве”. Цікава, ці дадумаецца хто выправіць памылку?

Моўныя заўвагі. На апошнім свяце “Дажынкі” адбылася дзіўная імпрэза – прымусілі бедных парсючкоў бегаць навыперадкі. Адзін карэспандэнт назваў гэта скачкамі. Але ж наўрад ці на тых парсючках былі наезнікі, таму слова “скачкі” не падыходзіць. Другі карэспандэнт назваў гэта так – бягі. Гэта няўдалы пераклад з рускай. Найлепш было б назваць гэта – забегі. Але галоўнае, пра што трэба сказаць: гэтыя парсюковыя забегі – сапраўднае свінства, негуманныя адносіны да свойскай скаціны.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# АВІТАМІНОЗЫ

## МНОГА ЧАЛАВЕКУ ТРЭБА, КАБ ЖЫЦЦЁ БЫЛО ЖЫЦЦЁМ

Антон Паўлавіч Чэхаў так адгукнуўся на панурую тэзу Талстога, што, маўляў, “чалавеку патрэбны толькі тры аршыны зямлі”, — тры аршыны патрэбны трупу, а жывому чалавеку патрэбны ўвесь свет!

Кажуць, існуюць індыйскія ёгі, якія здольны сілкавацца адной касмічнай энергіяй, не спажываючы ніякіх зямных прадуктаў.

Можа, гэта і так, і такім макарам можна пражыць гадоў сто ці сто дваццаць.

Але што гэта за жыццё – без паху свежавыпечанага хлеба, без церпкай духмянай гарбаты, без нагрэтага сонцам падласага сакавітага яблыка? (“Падласы” – так у нас у вёсцы называлася тое, што расейцы завуць “румяный”.)

У нас за хлявом расла груша-дзічка. Але – незвычайная: каржакаватая, разлапістая, бы шацёр, ледзь можна было абхапіць камель рукамі. Кожны год на ёй з’яўляліся тысячы маленькіх, як вузялочкі грушак – спярша зялёных, а потым – залатых. Паступова яны ападалі, усцілаючы зямлю залацістым дыванам, напаняючы паветра лёгкім водарам... а які быў іх смак! Яны не былі даўкімі і кіслымі, як іншыя дзічкі – іх можна было есці цалкам, пакідаючы толькі доўгі хвосцік. Іх сушылі, мачалі ў бочках, раздавалі добрым людзям – усім хапала.

А потым яна памерла.

“Дрэвы паміраюць стоячы” – быў такі фільм некалі.

З таго часу я, дзе б ні быў, кідаюся да любой грушы-дзічкі – а раптам зноў адчую той незабыўны смак? Няма...

Гэтага авітамінозу ўжо мне не вылечыць.

А мой бацька расказваў пра аднаго вяскоўца, які з’ехаў быў у Амерыку – ды вярнуўся. Бо – усяго там хапала, і хлеба, і да хлеба, але ж так хацелася беларускага сала пад’есці і на беларускай печы паляжаць...

Ды прыйшлі потым “таварышы”, якіх так доўга чакаў Максім Танк, — і трапіў бедны чалавек замест цёплай печы на халодныя нары...

А добра на беларускай печы – пахла аўчынай, нагрэтай глінай, грыбамі, што сушыліся ў пячорцы. І можна было ляжаць і гадзінамі разглядаць драўляную столь – знаходзячы ва ўзорах то дзівосных звяроў,то чалавечкаў...

Многа, многа чалавеку трэба, каб жыццё было жыццём – і часам ён падсвядома шукае тых вітамінаў, без якіх можна загінуць. Як хворы звер шукае патрэбнай травы.

У нас ёсць сусед, які мае нібыта ўсё – вялікі дом, аўтамабіль, лазню, тэлевізар з відэа... ды вось бяда – пагаварыць няма з кім! У свой час жонка яго пакінула, забрала сына, бацька памёр – адзін застаўся, і прыходзіць чалавечак да нас, і гаворыць, гаворыць... “Я ведаю мала, затое расказаць магу шмат!” – кажа. І яму амаль не трэба суразмоўнік, яму патрэбны “пустыя вушы”.

А яшчэ раней, калі мы жылі ў шматкватэрным доме, мелі самотную суседку, якая таксама прыходзіла да нас выгаварыцца.

І даканаў яе-такі “авітаміноз” адзіноты – “працёк у яе дах”, і трапіла ў “псіхушку”...

А здавалася б – усяго толькі й не хапала, паразмаўляць...

То бярыце пляшку чырвонага ці белага віна, прыходзьце, сядзем пад старой яблыняй і будзем гаварыць – пра ўсё на свеце.

І будзем здаровы!

**Алег Аблажэй**

## ФОТАФАКТ



**Механізатары на Дажынках** *стаяць у чарзе па ўзнагароды. Бабруйск. 7 кастрычніка 2006 году.*

## Невядомая Беларусь

**12 кастрычніка** 1925 году ў Берліне пачалася Другая Ўсебеларуская Канферэнцыя. Беларускія палітыкі, якія паверылі, што ў БССР можна рэалізоўваць ідэалы нацыянальнага адраджэння, пераконвалі сваіх калег-эмігрантаў «скласці зброю» і спыніць барацьбу з бальшавікамі. На той Берлінскай канферэнцыі паўнамоцтвы ўраду БНР нібыта былі перададзеныя ўраду БССР. Аднак старшыня Рады БНР Пётра Крэчэўскі і ягоны намеснік Васіль Захарка гэтага рашэння не прызналі. Як паказала гісторыя, слушна зрабілі. Бо нацыянальнае адраджэнне ў савецкім Мінску хутка змянілася жорсткай русіфікацыяй і патанула ў крыві масавых рэпрэсіяў.

**13 кастрычніка** 1896 году ў Пецярбургу нарадзіўся Мікалай Шчакаціхін, выдатны беларускі гісторык культуры і педагог. Даследаваў гісторыю беларускага мастацтва ад яго вытокаў да сучаснасці — вывучаў старажытныя фрэскі, абразы, архітэктурныя помнікі, гравюры выданняў Скарыны. У 1937 годзе Шчакаціхін быў расстраляны савецкімі карнымі органамі.

**14 кастрычніка** – дзень нараджэння трактара «Беларусь». Менавіта ў гэты дзень 1953 году з канвеера Мінскага трактарнага заводу сыйшла першая такая машына.

**16 кастрычніка** ў розныя гады прыйшлі на свет беларускі мастак Барыс Забораў, які жыве ў Парыжы, і беларускі паэт Сяржук Сокалаў-Воюш, які жыве ў ЗША.

**18 кастрычніка** 1905 году ў Мінску адбыўся расстрэл царскімі войскамі і паліцыяй арганізаванага эсэрамі мітынгу працоўных на Прывакзальнай плошчы на загад губэрнатара Курлова. 80 чалавек былі забітыя, некалькі соцэнь — параненыя. Сама падзея ўвайшла ў гісторыю пад назвай Курлоўскага расстрэлу.

# ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!

ХТО СЁННЯ РАТУЕ ГОНАР БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ?

**“ПЫТАННЕ ТЫДНЯ”** І **“КАМЕНТАР”**; **“БЕЛАРУСЬ - РАСІЯ”** - АБ ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННЯХ ДЗЬВЮХ ДЗЯРЖАВАЎ ;

**“ЧАГО НЕ ПАКАЗВАЕ БТ”** -АКТУАЛЬНЫЯ ПАДЗЕІ Ў КРАІНЕ І ЗА МЯЖОЙ, ЯКІХ ВА ЎПОР НЕ БАЧАЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫЯ СМІ;

**“САЮЗДРУК”** - ТЭНДЭНЦЫЙНЫ АГЛЯД БЕЛАРУСКІХ ГАЗЕТ;

**“ЯК РОБЯЦЦА ХВАЛІ”** - ВОДГУКІ НА ПАПУЛЯРНЫЯ РАДЫЁПЕРАДАЧЫ І МОВУ РАДЫЁЖУРНАЛІСТАЎ;

**“СТРЭМКІ”** - ЗАЙМАЛЬНЫЯ ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ;

**“ФОТАФАКТ”** - СУЧАСНАСЦЬ У АБ’ЕКТЫВЕ;

**“НЕВЯДОМАЯ БЕЛАРУСЬ”** - ТОЕ, АБ ЧЫМ ВЫ НЕ ВЕДАЛІ, АЛЕ БАЯЛІСЯ СПЫТАЦЬ;

І **“НАРЭШЦЕ”** - ІРАНІЧНЫ ПОГЛЯД НА СУР’ЁЗНЫЯ РЭЧЫ.

---




**МАТЭРЫЯЛЫ ПАД ГЭТЫМІ ДЫ ІНШЫМІ ПАСТАЯННЫМІ РУБРЫКАМІ ГАЗЕТЫ ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ НА СТАРОНКАХ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ “СВАБОДА”, АЛЕ І Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ VILNIA.COM**

**ТУТ, У РАЗДЗЕЛЕ *“АРХІЎ”* ВЫ МОЖАЦЕ ТАКСАМА ЗНАЙСЦІ АПОШНІЯ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ Ў ФАРМАЦЕ PDF; ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

## “СВАБОДА” БУДЗЕ ЗА НАМІ!

---

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў